■ Кантрамарка

# ФІЗІКА І ЖЫЦЦЁ: ТЫ МОЖАШ РАШЫЦЬ ЛЮБУЮ ЗАДАЧУ

**Спектакль «Паліва», паказаны ў межах Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва «ТЕАRТ», доўжыцца на працягу 5 250 удараў майго сэрца. На працягу аднаго глыбокага ўдыху і выдыху. На працягу 17 асабістых успамінаў. Фінал спектакля адмаўляе ўсялякую глядацкую фіксацыю. Аднак мне падалося важным занатаваць гэтыя факты. І некалькі іншых.**




У пачатку 2010-х на сцэнах маскоўскіх тэатраў «Мастерская» і «Практика» паспяхова прайшоў дакументальны праект «Чалавек.doc». Праект складаўся з дзесяці монаспектакляў, героямі якіх сталі выдатныя асобы расійскай культурнай прасторы. Са сцэны гучалі сапраўдныя жыццёвыя гісторыі мастака-акцыяніста Алега Куліка, рэпера Смокі Мо, кітаязнаўцы і перакладчыка Браніслава Вінагродскага ды іншых. Паспяховасць праекта натхніла стваральнікаў на «другую серыю», дзе ў цэнтр увагі трапілі ўжо выдатныя прадстаўнікі IT-сферы. Аднак цэльнага праекта ў выніку не атрымалася. І асобныя тэксты, што рыхталіся для «Чалавек.doc-2», зажылі сваім жыццём. Так, п'еса «Паліва», створаная драматургам Яўгенам Казачковым на падставе гутарак з IT-бізнесменам і актуальным мастаком Давідам Янам, была пастаўлена Сямёнам Александроўскім у незалежным Pop-up тэатры ў Санкт-Пецярбургу.

«Паліва» Александроўскага параўноўваюць і з серыялам, і са стэндапам, і з лекцыяй. Аднак большасць прыкмет выдае якраз кананічны дакументальны спектакль. Спачатку Яўген Казачкоў гадзінамі распытваў Давіда Яна пра розныя акалічнасці яго жыцця: паступленне ў фізтэх, вучобу, пустэльніцкі вопыт у псіхіятрычнай лякарні, стварэнне першай камп'ютарнай праграмы, захапленне флэшмобамі, выбар паміж навукай і бізнесам. Пасля драматург зманціраваў з інтэрв'ю-плыні гадзінную п'есу-маналог, а рэжысёр Сямён Александроўскі надзвычай чула паставіўся да асобы і яе прамовы, расставіў патрэбныя акцэнты і адшукаў разам з выканаўцам Максімам Фаміным дакладную інтанацыю.

Сканцэнтруйцеся на гэтым моманце. Хто сядзіць побач з вамі? Што вы адчуваеце тут і цяпер? Спектакль пачынаецца з унутраных адказаў залы на гэтае пытанне і пошуку асабістага пункта адліку ў сістэме каардынат Давіда Яна, дзе рух у пошуках паліва, неабходнага для жыцця, адбываецца з дзіўнай хуткасцю. «У дзіцячым садку я разлічыў хуткасць, з якой плыве воблака, — прамаўляе герой. — Воблака праплывала за акном за пяць удараў майго сэрца». Падчас спектакля кожны з гледачоў намагаўся знайсці адзінку вымярэння для таго паліва, што дае сілы жыць.

Герой існуе ў пустой сцэнічнай прасторы на фоне вялізнага экрана. Апавяданне падзелена на своеасаблівыя абразкі, назвы якіх, як кропкі на графіку, візуалізуюць крывую нашага сэнсавага, эмацыйнага руху: «Сякеры», «Тры сямёркі», «Медытацыя». Часам экран раздвойвае ці растройвае персанажа, ствараючы ілюзію ўнутранага дыялогу, які кожны час ад часу вядзе сам з сабой. Альбо дазваляе пабачыць урыўкі тых флэшмобаў, пра якія расказвае Ян: вось процьма незнаёмых людзей становяцца ў ланцужок на Чырвонай плошчы, вось наведвальнікі мастацкай выстаўкі раптоўна кладуцца на кароткі час на прыступкі музейнай лесвіцы, спыняючы рух. У пэўныя моманты экран можна прыняць і за дошку ў аўдыторыі, на якой вось-вось з'явяцца бясконцыя радкі формул. Параўнанне з лекцыяй узнікае не толькі праз візуальнае падабенства, але і праз тую манеру існавання, манеру прамаўлення тэксту, якую выбірае Фамін разам з рэжысёрам. Акцёр захоўвае ачужанасць выканаўцы ад персанажа, характэрную для ўвасаблення дакументальных п'ес, але ў той жа момант і не імкнецца да поўнай перадачы маўленчых характарыстык героя, засяроджваецца на сэнсе і фабуле. У выніку глядач пагаджаецца з умоўнасцю: перад намі акцёр Максім Фамін, якому важна пераказаць для нас маналог Давіда Яна. І калі недзе за сцэнай недарэчы з'явіцца водгулле музыкі ці нехта ў зале зашамаціць абгорткай ад цукеркі, ён зверне на гэта ўвагу.

Фінал спектакля, калі Фамін агучвае некаторыя правілы флэшмоба (флэшмоберы не павінны камунікаваць да, падчас і пасля акцыі адзін з адным; пасля акцыі трэба разысціся з месца дзеяння ў розныя бакі, не падаючы выгляду, што адбылося нешта незвычайнае і г.д.), пераконвае: канцэпцыя гэтай мастацкай масавай акцыі стала асновай рэжысёрскага рашэння. І пакуль Максім Фамін расказваў пра жыццё Давіда Яна, кожны з гледачоў думаў пра сваё, адчуваў свой момант, шукаў сваё паліва. Зрэшты, матэрыял дазваляў. Ян скончыў адну з самых прэстыжных навучальных устаноў Расіі — Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут. Выпускнікі МФТІ сустракаюцца ў Стакгольме падчас уручэння Нобелеўскай прэміі і ў літаральным сэнсе шалеюць ад навукі ды аб'ёмаў работы. Ну чым не метафара і крайнія пункты развіцця магчымых жыццёвых сцэнарыяў сучаснага чалавека? Але ж «Паліва» — гэта вельмі пазітыўная гісторыя. Нават нязвыкла пазітыўная для дакументальнага тэатра. Тое сакральнае, што Ян спазнаў дзякуючы фізтэху: адчуванне «ты можаш рашыць любую задачу», — здаецца, можа перажыць кожны. Галоўнае знайсці сваю хуткасць і сваё паліва.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ.**
**Фота прадастаўлена прэс-службай «ТЕАRТ»**

■ Чулі?

# МОСТ ЦЯПЕР ПАД НАДЗЕЙНАЙ АХОВАЙ

Нарэшце спраўдзілася тое, чаго ў Магілёве чакалі ўжо даўно — завяршальным акордам рэканструкцыі Дняпроўскага моста па Пушкінскім праспекце стала ўстаноўка з чатырох яго бакоў бронзавых ільвоў. Яшчэ ў суботу ў ваколіцах самай маштабнай сёлета будоўлі шчыравалі гараджане, якія адгукнуліся на прызыў прыняць удзел у агульнагарадскім суботніку, а ў нядзелю раніцай да месца сваёй прапіскі прыбылі велічныя прыгажуны. Два аднолькавыя драпежнікі, якія стаяць у поўны рост, абапіраючыся на шар, занялі свае месцы на ўездзе з боку Дняпроўскага спуску і вуліцы Чалюскінцаў, яшчэ два — грацыёзна «ўляглiся» на пастаментах з боку Пушкінскага праспекта. Сведкамі падзеі сталі ў асноўным запрошаныя асобы, а для большасці гараджан сустрэча з ільвамі адбылася ў панядзелак, калі яны ехалі на работу. Менавіта ў гэты дзень быў адноўлены рух тралейбусаў праз мост.


Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.

Скульптуры сапраўды ўражваюць, іх вышыня складае 2,4 і 1,8 метра, даўжыня — 3,15 метра. Іх аўтар магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў спецыяльна ездзіў у Маскву да братоў Запашных, каб station назіраць, як паводзіць сябе цар звяроў у жыцці. Прататыпам магілёўскіх ільвоў стаў драпежнік-альбінос па мянушцы Джон.

— Цяпер мост і ў цэлым Магілёў ахоўваецца львамі. Нездарма адна з версій заснавання горада звязана з гэтым велічным зверам, — задаволены зробленай работай мэр горада Уладзімір Цумараў. Ён, дарэчы, аўтар ідэі, пра што сведчыць спецыяльны надпіс на пастаменце на беларускай мове.

Акрамя бронзавых скульптур, мост упрыгожваюць 118 медальёнаў з маскай льва і гербам Магілёва. Яны чаргуюцца на металічных пралётах яго агараджальных збудаванняў. Да рэканструкцыі на медальёнах была сімволіка ў выглядзе сцяга і сярпа з молатам.

Нагадаем, што мост быў на капітальным рамонце з леташняга чэрвеня. За гэты час ён стаў шырэйшы на 13 метраў і даўжэйшы на 12. Колькасць палос для руху транспарту павялічыцца з 4 да 6. Праведзена замена пралётных канструкцый на сталебетонныя, зроблена ўзмацненне існуючых апор. Усё гэта дало магчымасць павялічыць прапускную здольнасць моста на 30%. Рэканструкцыяй было прадугледжана будаўніцтва падземнага пешаходнага перахода, перабудова кантактнай тралейбуснай сеткі, сеткі вулічнага асвятлення і падземных інжынерных камунікацый.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

## 26 КАСТРЫЧНІКА

**1810** год — нарадзіўся (вёска Забалоцце, цяпер у Міёрскім раёне) Генрых Міхайлавіч Дмахоўскі, беларускі скульптар. Адзін з кіраўнікоў рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, Літве і Польшчы. У 1828 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. Пасля разгрому паўстанняў 1830-1831 гадах эмігрыраваў у Францыю. У 1841—1851-м вывучаў скульптуру і працаваў скульптарам у Парыжы, з 1851-га — у ЗША. У 1861 годзе вярнуўся на Радзіму. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1863-1864 гадоў. Стварыў помнікі героям паўстання 1848 года ў Познані, бюсты Т. Касцюшкі, У. Сыракомлі, медальён з сілуэтамі павешаных дзекабрыстаў. Загінуў у баі ў 1863 годзе.

**1861** год — 155 гадоў таму нямецкі вынаходнік Філіп Рэйс прадэманстраваў у Франкфурце-на-Майне апарат, які перадае гукі на адлегласць пры дапамозе электрамагнітных ваганняў. Гэты прыбор ён назваў тэлефонам.

**1911** год — нарадзіўся (г. Рэчыца) Мікалай Сінюцін, Герой Савецкага Саюза, удзельнік савецка-фінскай вайны 1939-1940 гадоў. Камандзір батальёна. Вызначыўся ў лютым 1940 г. пры ўтрыманні тактычна важных вышынь на Карэльскім перашыйку. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны — на фронце. Загінуў у баі 5 лістапада 1941 года.



**1921** год — 95 гадоў таму нарадзіўся (г. Орша) Мікалай Лявонцьевіч Часнык, Герой Савецкага Саюза. На фронце з 1941 года — быў лётчыкам-знішчальнікам, камандзірам авіяэскадрыллі палка асаблівага прызначэння. Здзейсніў 685 баявых вылетаў. 7 ліпеня 1944 года збіты ў баі, трапіў у палон. Быў удзельнікам паўстання ваеннапалонных канцлагера Бухенвальд. Да 1958 года служыў у ВПС Савецкай Арміі. Памёр у 1993 годзе.

**1932** год — вышэйшыя савецкія кіраўнікі, у тым ліку І.В. Сталін, В.М. Молатаў, К.Я. Варашылаў, сустрэліся з пісьменнікамі, якія сабраліся ў Максіма Горкага ў яго маскоўскім доме на Малой Нікіцкай — раскошным асабняку, пабудаваным Ф.А. Шэхтэлем для аднаго з братоў Рабушынскіх. Менавіта на гэтай сустрэчы Сталін назваў пісьменнікаў «інжынерамі чалавечых душ», дадаўшы да гэтага, што «вытворчасць душ важней вытворчасці танкаў». Наркам абароны Варашылаў паспрабаваў заступіцца за танкі, аднак быў спынены правадыром... Выступленне Сталіна было выслухана з вялікай увагай. Ён гаварыў пра намер стварыць Саюз пісьменнікаў СССР, пра творчыя задачы, якія будуць стаяць перад гэтым саюзам, пра яго матэрыяльную базу. Не забыў таварыш Сталін і пра метад сацрэалізму: «Мастак павінен праўдзіва паказаць жыццё. А калі ён будзе праўдзіва паказваць наша жыццё, то ў ім ён не можа не заўважыць, не паказаць таго, што вядзе яго да сацыялізму. Гэта і будзе сацыялістычны рэалізм».

Было сказана

**Анатоль АСТРЭЙКА, паэт:**
*Не разбурай страху над галавой,*
*Бо сёння сонца, заўтра ж —*
*Дождж пральецца.*

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Паўночны лімон з яркімі кветкамі

*Хенамелес даўно выкарыстоўваюць ландшафтныя дызайнеры ў афармленні кветнікаў, лужкоў і камяністых горак. Ён выдатна глядзіцца як у адзіночных пасадках, так і ў кампазіцыі з іглічнымі і лісцевымі раслінамі. Таксама яго выкарыстоўваюць у якасці нізкай жывой агароджы. Лічыцца выдатным меданосам.*

**Хенамелес, або айву японскую, часта называюць паўночным лімонам з-за кіслых пладоў з вялікім утрыманнем вітаміну С. Ды і па знешнім выглядзе шматлікія гатункі нагадваюць лімон. І колер такі ж жоўты.**

Родам хенамелес з гор Японіі. Спадабаўся японскі горац і жыхарам сярэдняй паласы ў асноўным дзякуючы высокай марозаўстойлівасці. Хенамелес вытрымлівае маразы да -30 °С, а за кошт снежнага покрыва можа перажыць самую суровую зіму. Кусты рэдка вырастаюць вышэй за метр. Японскую айву вырошчваюць не толькі як дэкаратыўны куст, але і дзеля вітамінных пладоў.

Зацвітае хенамелес у маі, прычым цвіце вельмі доўга і багата. У яго прыгожыя яркія аранжава-чырвоныя кветкі з глянцавым бляскам, якія нагадваюць чымсьці кветкі шыпшыны.

**КУПІЦЕ ПАРАЧКУ НА РАЗВОД**

Калі вы вырашылі пасадзіць японскую айву для атрымання вітамінных пладоў, то саджайце мінімум дзве расліны, бо без апыляльніка вы іх наогул не дачакаецеся, альбо іх будзе ўсяго адзін-два на кусце.



Калі айва адцвіце, на ёй утвараюцца плады памерам з яйка, якія паспеюць у канцы верасня-кастрычніку. Тады яны набудуць жоўты колер і яркі, уласцівы толькі айве, водар. «Яблыкі» на японскай айве на смак кіслыя і вяжучыя.

**РАЗМНАЖЭННЕ**

Размнажаецца японская айва насеннем, якое высяваюць восенню. За зіму яно праходзіць натуральную стратыфікацыю, і да наступнай восені саджанцы дасягаюць у вышыню 40 см. Праз тры гады японская айва дасць першы ўраджай, а праз пяць гадоў з яе ўжо можна будзе здымаць па 5 кг з куста.

Айва таксама размнажаецца зялёнымі чаранкамі, адраўнелымі чаранкамі і гарызантальнымі адводкамі. Праўда, гэтыя спосабы досыць складаныя і расліны не заўсёды прыжываюцца.



Абразаюць хенамелес, як і большасць ягадных кустоў, вясной. Выдаляюць старыя галінкі і тыя, якія не даюць пладоў, пакідаючы добра развітыя парасткі рознага ўзросту. У дарослага пладаноснага куста іх павінна быць не больш за 15.

**КУДЫ ПАСАДЗІЦЬ**

Ідэальны варыянт — калі на ўчастку растуць тры японскія айвы. Размяшчаюць іх на адлегласці 1,5 м адзін ад аднаго. Месца для кустоў лепш выбраць адкрытае і сонечнае. Каранёвая сістэма ў хенамелеса магутная, карані ідуць глыбока ў глебу і добра адгукаюцца на палівы і ўнясенне ўгнаенняў.

**ЧЫМ ПАДКАРМІЦЬ**

Першы раз хенамелес падкормліваюць у канцы зімы або ў самым пачатку вясны, раскідваючы па снезе пад кустамі мінеральныя ўгнаенні.

На працягу лета падкормліваюць яшчэ парутройку разоў растворам каравяку (1 л настою на вядро вады).

Адразу пасля збору ўраджаю глебу пад кустамі варта перакапаць, папярэдне ўнёсшы вядро гною, які добра перапрэў.

**ШТО РАБІЦЬ З УРАДЖАЕМ**

З пладоў японскай айвы атрымліваецца выдатнае духмянае варэнне і сіроп, які можна зрабіць па наступным рэцэпце: плады рэжуць на кавалачкі, складваюць у таз або слоікі і перасыпаюць цукрам. Праз суткі ўтвараецца сіроп цудоўнага смаку і водару, які можна захоўваць у падвале ці халадзільніку амаль цэлы год. Гэты сіроп багаты вітамінамі і лічыцца выдатным дадаткам да зімовага чаю.

# Як правільна саджаць часнок восенню

**Часнок для пасадкі восенню называецца «азімы». Азімыя гатункі часнаку ў большасці сваёй стралкуюцца. У гэтым выпадку нароўні з падземнай цыбулінай на стрэлцы развіваецца суквецце, у якім маюцца так званыя «паветраныя цыбулінкі». Але бываюць і такія гатункі, якія не даюць стрэлкі.**

**ПАДРЫХТОЎКА ГЛЕБЫ**

Часнок любіць участкі з суглінкавымі ўрадлівымі нейтральнымі глебамі. Самыя лепшыя папярэднікі часнаку — капусныя, гарбузовыя, бабовыя культуры і зеляніна. На тых глебах, дзе раслі цыбуля і часнок, вырошчваць яго можна толькі праз 3—4 гады.

Градку трэба рабіць на сухім, сонечным месцы. Пачынаюць падрыхтоўку градкі ў жніўні, гэта значыць, прыкладна за 1—1,5 месяца да высадкі азімага часнаку.

На 1 квадратны метр суглінкавай глебы неабходна ўнесці вядро кампосту або перагною, па 1 сталовай лыжцы нітрафоскі і суперфасфату, 1 шклянку вапны-пушанкі або даламітавай мукі.

Калі глеба бліжэй да глiністай, то яшчэ трэба дадаць вядро торфу на 1 квадратны метр для дасягнення патрэбнай глебавай структуры. Калі глеба тарфяная, то трэба ўнесці дадаткова вядро суглінкавай глебы. У пясчаныя глебы трэба ўнесці 1 вядро глiністай глебы, 1 вядро торфу і ўсё тое, што рэкамендавалася вышэй для суглінкавай глебы. Далей трэба ўсё перакапаць на глыбіню 20 сантыметраў. Потым неабходна выраўнаваць градку, злёгку ўтрамбаваць яе і апрацаваць растворам меднага купарвасу з разліку 40 грам на 10 літраў вады. Гэтага раствору хопіць для апрацоўкі 10 квадратных метраў градак. Гэта значыць, 1 літр раствору на 1 квадратны метр.

Замест меднага купарвасу можна выкарыстоўваць раствор хлорвокісу медзі (гэта прэпарат «Хом»), з разліку 20 грам на вядро вады. Расход раствору той жа.

Да высадкі часнаку градку трэба накрыць плёнкай.

**ТЭРМІНЫ ПАСАДКІ**

Азімы часнок трэба высаджваць за 35—45 дзён да наступлення пастаянных халадоў. За гэты час высаджаныя зубкі павінны паспець добра ўкараніцца, развіць добрую каранёвую сістэму, глыбінёй пранікнення 10—12 сантыметраў. Але пры гэтым з зубкоў не павінна прарасці лісце. Трэба ўгадаць з тэрмінам пасадкі, бо рана высаджаны часнок прарастае, а позна пасаджаны — падмярзае.

**ПАДРЫХТОЎКА ЧАСНАКУ**

Для пасадкі выкарыстоўваць свежасабраны азімы часнок. Неабходна адабраць добра прасушаныя, здаровыя часночыны, акуратна падзяліць на зубкі, імкнучыся як мага менш пашкоджваць іх. Іх трэба патрымаць на працягу 1-2-х хвілін у растворы паваранай солі (на 5 літраў вады 3 сталовыя лыжкі). Далей перакласці зубкі ў раствор меднага купарвасу (1 сталовая лыжка на 10 літраў вады) і вытрымаць у ім 1 хвіліну. Пасля дадзенай працэдуры абеззаражвання зубкі, не прамываючы вадой высаджваюць на градкі.

**СХЕМА ПАСАДКІ**

Спачатку трэба ўздоўж градкі зрабіць баразёнкі глыбінёй 6—8 сантыметраў на адлегласці 20—25 сантыметраў адна ад другой. Зубкі ў баразёнкі трэба высаджваць так, каб да зубка ад паверхні глебы заставалася 4-5 сантыметраў. Адлегласць паміж зубкамі — 7-8 сантыметраў. Ставіць зубкі ў баразёнку трэба вертыкальна, донцам уніз, але дапускаецца і класці зубкі «на бачок».

Праз 2-3 тыдні пасля высадкі для лепшай зімоўкі трэба пасыпаць градку з часнаком 2-сантыметровым пластом перагною або торфу.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.59 | 17.47 | 9.48 |
| Віцебск | — 7.52 | 17.34 | 9.42 |
| Магілёў | — 7.49 | 17.38 | 9.49 |
| Гомель | — 7.42 | 17.38 | 9.56 |
| Гродна | — 8.13 | 18.03 | 9.50 |
| Брэст | — 8.10 | 18.07 | 9.57 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 22.10—29.10.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Веньяміна, Карпа, Мікіты.*
***К.*** *Людмілы, Дзімітра, Люцыяна.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Каб падабацца дзяўчатам, трэба быць разумным, прыгожым, багатым... або катом.**

— Хадзіў здаваць экзамен?
— Хадзіў...
— А які білет выцягнуў?
— Ваенны.

**Цяжка ўсё-такі быць жанчынай.**
**Пастаянна хочацца чаго-небудзь купіць, каго-небудзь прыбіць, пахудзець і піражнае...**

Дзве сяброўкі.
— Чакаеш прынца на белым «Лексусе»?
— Ай, абы чалавек быў добры! Колер кузава значэння не мае.



Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 кастрычніка 2016 года.